ЦАРКОЎНАПРЫХО́ДСКІЯ ШКО́ЛЫ (ЦПШ), адзін з тыпаў пачатковых царкоўных школ. Падпарадкоўваліся Св. Сіноду, давалі адукацыю ў духу правасл. веры і царквы. Фактычна існавалі пры цэрквах і манастырах задоўга да афіц. іх прыз-

нання ў 1836, калі імператар Мікалай І запрасіў правасл. духавенства навучаць сялянскіх дзяцей чытанню, пісьму і лічэнню. Да пач. 1860-х г. наз. «царкоўныя школы», «школы свяшчэннікаў», «прыходскія вучылішчы». Паводле «Правіл аб царкоўнапрыходскіх школах» (13.6.1884) ЦПШ падзяляліся на аднакласныя з 2-гадовым і двухкласныя з 4-гадовым курсам навучання. У іх выкладаліся: Закон Божы, царк. спевы, чытанне царк. і грамадз. друку і пісьма, пачатковыя звесткі па арыфметыцы, у 2-класных яшчэ і звесткі з царк. і рас. гісторыі. Паводле «Палажэння аб царкоўных школах ведамства праваслаўнага веравызнання» (1.4.1902) курс навучання ў аднакласных ЦАШ павялічаны да 3 гадоў, у 2-класных — да 5 гадоў. У іх выкладаліся Закон Божы, царк. спевы, царк.-слав. грамата, рус. мова, пісьмо, пачатковая арыфметыка, для дзяўчынак — рукадзелле; у 2-класных яшчэ кароткая царк. і рас. гісторыя, геаграфія з кароткімі звесткамі пра з'явы прыроды, чарчэнне і, пры магчымасці, маляванне. Акрамя звычайных агульнаадукац. ЦПШ на Беларусі існавалі 2-класныя царкоўна-настаўніцкія школы (да 1902), школы з рамеснымі аддзяленнямі (Вайханская Гарадоцкага пав. са сталярным, Межаўская Полацкага пав. з кавальска-слясарным), з с.-г. і рамесным аддзяленнямі (хутар Прыволле Аршанскага пав.), чыгуначныя (Аршанская, Жлобінская, 2 Гомельскія) для падрыхтоўкі дзяцей служачых чыгункі да паступлення ў тэхн. чыгуначныя вучылішчы. Вучэбны курс у апошніх быў пашыраны за кошт матэм. прадметаў. У ЦПШ вучыліся ў асн. дзеці бел. сялян правасл. веравызнання. ЦПШ былі бедна абсталяваны, знаходзіліся ў непрыстасаваных памяшканнях, вучням не хапала вучэбных дапаможнікаў, выкладчыкі мелі нізкі адукацыйны ўзровень. Намаганнямі Сінода, духавенства, часткі грамадства ў 1910-я г. ЦПШ па ўзроўні навучання наблізіліся да аднатыпных школ інш. ведамстваў. Напярэдадні 1-й сусв. вайны сельскія ЦПШ Беларусі ўключаны ў агульнагуб. школьныя сеткі ўсеаг. навучання. Утрымліваліся за кошт субсідый Сінода, мясц. сял. абшчын, губ. земскіх збораў, пасля ўтварэння земстваў — губ.-земскіх субсідый і прыватных ахвяраванняў. У 1911 у Літоўскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Полацкай і Мінскай епархіях існавала 75 двухкласных і 2523 аднакласных ЦПШ, у якіх навучалася 142 269 дзяцей. У 1913 у Літоўскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Полацкай епархіях каля 41% ЦПШ не мелі ўласных будынкаў, 2,2% настаўнікаў былі свяшчэннаслужыцелямі, 20,2% свецкіх настаўнікаў мелі вышэйшую або сярэднюю адукацыю, 5,3% — спец. пед. адукацыю, 71,9% — толькі званне настаўнікаў аднакласных школ, а астатнія — званне настаўніка школы граматы або не мелі ніякага пасведчання. У 1-ю сусв. вайну школы з зах. і цэнтр. Беларусі эвакуіраваны ці зачынены ў сярэдзіне 1915, на ўсходзе большасць школ працавала да 1918. Частковае адраджэнне ЦПШ пачалося ў 1990-я г. ў выглядзе нядзельных школ. *С.М.Васіліч.*